Источник: "Краязнаўчая газета" - 2019-12-12

# Аграрная палітыка нацыстаў у Заходняй Беларусі




Кнігу з такой назвай днямі набыў у краме «Акадэмкніга». Яе аўтар – Святлана Казлова (Бялоцкая), кандыдат гістарычных навук. Даследчыца нарадзілася ў 1978 г. у Брэсце. У 1995 – 2000 гг. вучылася на гістарычным факультэце Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна. У 2001 г. паспяхова скончыла магістратуру Універсітэта ў Беластоку (Польшча), у 2005 г. – аспірантуру Інстытута гісторыі НАН Беларусі. У 2004 г. праходзіла навуковую стажыроўку ў свабодным універсітэце Берліна (Германія). У 2006 г. паспяхова абараніла кандыдацкую дысертацыю. У 2006 – 2014 гг. працавала навуковым супрацоўнікам аддзела ваеннай гісторыі і міждзяржаўных адносінаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі, дацэнтам у мінскім інстытуце кіравання. З 2014 г. жыве і працуе ў Швецыі. Аўтар больш як 60 навуковых артыкулаў. Даследуе эканамічную палітыку нацыстаў у акупаванай Беларусі (1941 – 1944 гг.), пытанні ўдзелу беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі ў ваенных дзеяннях супраць Японіі ў 1945 г. і ў ваенных канфліктах Кітая і Карэі (1950 – 1953 гг.), а таксама пытанні оўруцкай шляхты ў XV – XIX стст.

У манаграфіі на падставе багатага корпуса архіўных крыніцаў, якія ўпершыню ўводзяцца ў навуковае абарачэнне, усебакова прааналізаваная аграрная палітыка нацыстаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1941 – 1944 гг. Асаблівая ўвага нададзеная пытанням планавання, забеспячэння і ажыццяўлення на практыцы аграрных мерапрыемстваў, прадугледжаных акупацыйнай палітыкай фашысцкай Германіі.

Кніга выйшла ў выдавецтве А.М. Янушкевіча накладам 500 асобнікаў. Навуковы рэдактар манаграфіі доктар гістарычных навук, прафесар Аляксей Літвін. У манаграфіі змешчаныя фотакопіі архіўных дакументаў.

Кніга будзе карыснай усім, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі перыяду Другой сусветнай вайны.

*Аляксей ШАЛАХОЎСКІ*

Аляксей Шалахоўскі. Аграрная палітыка нацыстаў у Заходняй Беларусі